# РОЛЯ ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКАГА СЕГМЕНТА РАДЫЁКАНАЛА «КУЛЬТУРА» Ў ВЫХАВАННІ КУЛЬТУРНАЙ АСОБЫ І РАЗВІЦЦІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ

**Н. Я. Гальпяровіч,**
*канал «Культура» Беларускага радыё*

За ўсю сваю багатую гісторыю мастацкае роднае слова было заўсёды візітоўкай айчыннага радыё, на яго хвалях гучалі галасы класікаў Янкі Купалы і Якуба Коласа, слухачы знаёміліся з лепшымі творамі беларускіх аўтараў, гучалі радыёпастаноўкі і кампазіцыі па іх вершах і апавяданнях, ставіліся радыёспектаклі. Нашы дыктары і артысты заўсёды былі эталонам выканальніцкага майстэрства, правільнага гучання беларускага слова. Сваё майстэрства на радыё адточвалі многія выдатныя майстры сцэны. Але самае галоўнае – з эфіру слухачы атрымлівалі сапраўдныя ўрокі высокага патрыятызму, любові да сваёй Бацькаўшчыны, роднай культуры, мастацкага слова. Сёння таксама шмат цікавага, адметнага, карыснага можна пачуць на ўсіх каналах нашага радыё. Па-ранейшаму госці нашых студый – выдатныя аўтарытэтныя людзі краіны, шмат увагі ўдзяляецца адлюстраванню нашай духоўнай спадчыны.

Спецыялізаваны канал «Культура» з першых дзён свайго існавання адным са сваіх прыярытэтаў вызначыў літаратурна-мастацкае вяшчанне. У агульным аб’ёме яно на сённяшні дзень складае амаль чвэрць ад усяго эфірнага часу канала, спрыяе не толькі знаёмству нашых слухачоў са скарбамі айчыннай культуры, творчасцю нашых сучаснікаў, а, што галоўнае, выхоўвае пачуццё гонару і павагі да духоўных здабыткаў народа.

Літаратура сёння – гэта неад’емная частка жыцця чалавека, адлюстраванне ўсіх зрухаў грамадскага жыцця. Таму ў сваёй дзейнасці мы кіруемся не толькі магчымасцю знаёміць слухачоў з літаратурнымі творамі айчынных і замежных майстроў слова, а максімальна звязваць гэта з сённяшняй грамадска-палітычнай сітуацыяй, з праблемамі, якія стаяць у сцвярджэнні высокіх гуманістычных ідэалаў, выхаванні любові да сваёй Радзімы, да гісторыі свайго народа. Гэта-

му служаць радыёспектаклі, чытанні ў прамым эфіры літаратурных твораў, гутаркі і інтэрв'ю з пісьменнікамі, рэпартажы аб кніжных прэзентацыях і сустрэчах творцаў з чытачамі.

Прыхільную ўвагу ў слухачоў заваявалі праекты «Літаратурная анталогія», «Радыёбібліятэка», «Радыётэатр плюс». Яны мелі магчымасць пазнаёміцца з творамі Кузьмы Чорнага, Івана Мележа, Івана Шамякіна, Васіля Быкава, Уладзіміра Караткевіча ў выкананні вядомых беларускіх артыстаў. Не засталіся па-за ўвагай творы сучасных майстроў пяра Людмілы Рублеўскай, Георгія Марчука, Ганада Чарказяна і іншых.

У праеце «Прачулым радком» штотыдзень па выхадных днях гучалі падборкі вершаў як класікаў роднай літаратуры Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Змітрака Бядулі, так і творы паэтаў пазнейшых пакаленняў – Уладзіміра Дубоўкі, Петруся Броўкі, Пятра Глебкі, Юлія Таўбіна, Сяргея Грахоўскага, Аляксея Пысіна, Пімена Панчанкі, Аркадзя Куляшова ды нашых сучаснікаў Алеся Разанава, Міколы Мятліцкага, Генадзя Пашкова, Леаніда Дранько-Майсюка. Усяго за мінулы вяшчальны сезон прагучала звыш пяцідзесяці такіх падборак.

Пра новыя кнігі, якія выходзяць у беларускіх выдавецтвах, расказвае праект «Кнігарня». У рамках гэтага праекта гучаць інтэрв'ю з выдаўцамі, аўтарамі, чытачамі.

Беларускія пісьменнікі нярэдкія госці праекта «Дыялогі пра культуру». Пра свае творчыя планы, пра ролю літаратуры ў грамадскім жыцці разважалі перад мікрафонам Алесь Бадак, Віктар Шніп, Міхась Пазнякоў, Алена Стэльмах, Уладзімір Сцяпан, Уладзімір Навумовіч, Анатоль Бутэвіч.

Па нядзелях і серадах штотыдзень на хвалях канала «Культура» гучыць радыёверсія тэлеперадачы «Суразмоўцы», героі якой у пераважнай большасці беларускія літаратары.

«Літаратура, як вядома, – важнейшая ўмова гуманітарнай адукацыі, эстэтычнага выхавання, развіцця творчага мастацкага мыслення», – заўважыў літаратурны крытык Міхась Тычына. Разумеючы гэта, супрацоўнікі канала «Культура» ў сваёй дзейнасці аддаюць перавагу літаратурным перадачам, якія нясуць дзяржаўна-патрыятычныя, нацыянальныя, агульна-чалавечыя, маральна-духоўныя ідэі. Закладзеныя ў нацыянальнай класічнай літаратуры і творчасці

нашых сучаснікаў, яны спрыяюць фарміраванню грамадзянска-патрыятычнага светапогляду нашых слухачоў, духоўна-маральнаму адзінству і кансалідацыі беларускага народа.

## СПЕЦИФИКА РАЗВИТИЯ INSTAGRAM-АККАУНТОВ РАДИОСТАНЦИЙ В ЦИФРОВОЙ СРЕДЕ (НА ПРИМЕРЕ РАДИОКАНАЛА «КУЛЬТУРА»)

**А. А. Градюшко**
*Белорусский государственный университет*

В современной цифровой среде уже не первый год отмечается глобальное снижение доверия к СМИ и рост потребления контента через социальные сети. В 2021 г. в ландшафте социальных медиа произошли значимые перемены. Если раньше лидирующие позиции занимала большая тройка: «ВКонтакте», Instagram и Facebook, то сейчас ситуация изменилась. Самыми популярными платформами стали Instagram, Telegram и TikTok. Значительный опыт в освоении интернет-пространства накопили и аудиовизуальные традиционные СМИ, для которых канал и сайт уже не являются основной площадкой.

В работах ученых, исследующих новые цифровые экосистемы, отмечается, что «редакции приходится собирать аудиторию «по крупицам» на всех возможных площадках социальных медиа. Журналистский контент в социальных медиа вынужден конкурировать не столько с публикациями других изданий, сколько с развлекательным контентом» [1, с. 98]. Разумеется, каждая площадка имеет свою специфику. Онлайн-опрос белорусской аудитории, в котором приняли участие 237 респондентов в возрасте от 14 до 30 лет, показал, что в 2021 г. молодежь чаще всего использует соцсеть Instagram (63,7 %). На втором месте по частоте обращения находится «ВКонтакте» (56,1 %), третье место занял TikTok (13,5 %) [2, с. 178].

Согласно полученным данным, самый большой рост в сегменте социальных медиа показывают платформы, ориентированные на визуальный контент. Пользователи «ВКонтакте» просто заходят почитать личные сообщения и затем переключаются на другие площадки,